Цэна асобнагонумэру 5 кап

# НАША НІВА

Выходзіць што тыдзень.

Адрэс рэдакціі і адміністраціі: Вільня, Завальная вуліца, д. № 7.

Цэна з перэсылкай і дастаўкай на 1 г. — 2 р. 50 к., на 6 мес. — 1 р. 25 к. на 3 м. — 65 к., на 1 мес. — 25 к. За граніцай: на 1 г. — 4 р., на 6 мес. — 2 р. 3 мес. — 1 р. Перамена адрэсу — 20 коп.

Абвесткі прыймаюцца на апошняй страніцы па 20 кап. за лінейку малымі літэрамі. Рукапісы і карэспандэнціі, прысланые у рэдакцію, павінны быць чытэльна напісаны с праўдзівай фаміліей і адрэсам таго, хто яе прысылае. Можна такжэ надпісаць прозвішчэ разам з фаміліей, хто не захочэ, каб была надрукавана праўдзівая фамілія Адрэс і фамілія толькі для ведама рэдакціі. Рукапісы аўторам не вертаюцпа назад.

Год VIII. 1 марца 1913 г. №. 9.

## Змаганьне съ хваробай.

Усё шырэй і шы. эй разрастаецца страшэнная хвароба—націоналізм. Яна не абмінае ніводнаго народу і ўсюды звівае сабе гняздо, захопліваючы ня толькі цёмных людзей, але і людзей съвядомых, каторые ведаюць, што добра і што дрэнна. І гдзе толькі прычэпіцца гэта хвароба, там у сэрцах людзкіх родзіцца ненавісць да кожнаго, хто іншай, чым ён сам, гутаркай гаворыць, хто да іншай нації належыць.

Націоналізм перакінуўся і ў нашу старонку, і тутака розные чорнасоценные газэты стараюцца нацкаваць адзін народ на другі. Але ў нашым краю гэткая агульная вайна—гэта страшэннае нешчасьце для ўсіх, не выключаючы і тых, каму націоналізм заліў сэрцэ і розум ненавісьцю. „Край с пяцьцю націямі" толькі тады можэ развівацца і багацець, калі кожная нація будзе поруч з другімі працаваць дзеля яго карысьці. Калі-ж заместа гэтаго ўсе мы будзем між сабой змагацца, калі свае творчэскіе сілы змарнуем на сваркі і грызьню без ніякай карысьці, дык не падзякуюць нам нашы дзеці і ўнукі, жывучы ў такойжэ цемнаце і беднасьці, як мы самі.

З гэтай прычыны нам асабліва трэба бараніцца ад націоналізму. Але мы адны рады не дамо: розные провокатары з расейскіх і польскіх чорнасоценных газэт датуль будуць муціць і дражніць наш народ нягоднай брахнёй і напасьцямі, аж пакуль і ў душу беларуса не закінуць зернят нацыональнай ненавісьці.

Проці гэтаго ёсць адна рада: ўсе, хто шануе ў іншым чэлавека, каму дораг наш край і доля яго, хто жадае лепшай будучыны свайму народу, — павінны, ня гледзячы, якой яны націі, падаць сабе рукі і супольнымі сіламі бараніцца ад паганай хваробы ды зніштожыць сяўбу невавісьці і злосьці.

Такая работа ўжо пачалася. Вось, бачым добрую жменю расейскіх, польскіх і літоўскіх газэт, каторые—каждая у сваім народзі—змагаецца с чорнасоценствам. У Вільні выходзяць „Вечэрняя Газэта", «Kurjer Krajowy», «Lietuvos Ukininkas», «Vilniaus Žinios», і ўсе яны поруч з «Нашай Нівай» ідуць да аднэй мэты: стараюцца развіваць „просты" народ, каб урэшці сам ён узяў свае справы у свае рукі і с пагардай адвярнуўся ад тых, хто хочэ выкарыстаць яго цемнату дзеля пашырэньня націоналізму.

Гэта паказывае, што у нашай старонцы шчырая дэмократычная думка мае сваіх прыхільнікоў *у кожнай нації*, што тут жывуць. І проці нягоднай работы ўселякіх націоналістоў і чорнасоценцоў узрастае новая сіла, каторая зможэ ўрэшці перэмагчы ўсё благое, што робяць яны нашаму краю.

Вера ў гэта і павінна абараніць беларусоў ад провокаціі ворагоў нашаго народу, ворагоў агульнай згоды націй, што жывуць на нашай зямлі.

а—н—а.

## Газэтнае хуліганства.

Нідаўна польскіе сумленные газэты паднялі думку аб тым, што людзей, каторые ў газэці фальшывяць чужые словы, трэба караць так сама, як злыднёў, што фальшывяць чужые подпісы на вэксэлёх. Вельмі шкадуем, што німа у нас такога закону: тады мо рэдактар чонасоценнай польскай газэціны „Gazeta Codzienna" не туманіў бы людзям голоў фальшывымі ведамасьцямі.

У нумэры 9 «Нашы Нівы» за 1908 год была надрукавана стацьця, ў каторай гаворыцца вось што:

„Беларусь, як ведама, ляжыць між Польшчаю і Вялікарасеяй. І с палякамі і з рускімі беларусам прыходзілося стыкацца з даўных часоў, ды гэта ёсць і цяперь. Са стараны Расеі да нас прыходзіць ні мала добраго: вялікарусы маюць сваю вялікую культуру; думкі лепшых рускіх людзей аб свабодзі, аб правох чэлавека, як сьвег сонца, шмат памаглі прабудзіцца нашаму краю і мужыку-беларусу ад векавечнаго сну, і наш мужык папраўдзі збудзіўся так сама, як мужык рускі, польскі, літоўскі. Ад рускай культуры мы бярэм навуку, знаньне абема рукамі. Што ёсць добрае і карыснае у рускіх, гэта беларусы ўводзяць і ў сваё жыцьцё.—Узноў жэ Польшча мае так сама вялікую культуру, і беларусам вельмі добра скарыстаць з гэтаго, колькі можна. Карысць ад палякоў відаць ужо і ў тым, што ў нашым краю сельская гаспадарка лепей нарыхтавана і стаіць вышэй, як у Расеі, Так сама ў тых губэрнях Беларусі, гдзе многа палякоў. граматных больш, як у іншых. Палякі—народ практычны, і ад іх шмат чаго могуць навучыцца беларусы. У Беларусі ёсць многа вучоных, культурных палякоў, дый такіх жэ рускіх, што ўжо зжыліся з нашым краем, працуюць для дабра яго".

З гэтых слоў, здаецца, ясна відаць, як глядзіць „Наша Ніва" на расейцоў і палякоў у нашай старонцы. Але «Gaz. Codz.», карыстаючы с таго, што гэта было надрукавана пяць гадоў таму назад і што мала хто памятае нашу стацьцю, зрабіла з яе вось які ужытак: вырвала з сярэдзіны колькі слоў—«ад рускай культуры мы бярэм навуку, знаньне абема рукамі»—ды растлумачыла іх гэтак: «Наша Ніва» рупіцца аб тое, каб беларусы перэрабіліся на расейцоў, а поруч з гэтым стараецца апаганіць усё польскае"...

Такая работа называецца проста: *газэтным хуліганствам*.

## Зьездъ Таварыства кружкоў імені Сташыца.

У пятніцу, суботу і нядзелю у Варшаві адбыўся зьезд прэдстаўнікоў Сташыцоўскіх кружкоў.

Сташыцоўскімі гэтые кружкі назвалі у памяць таго, што Сташыц быў чэлавек вялікай заслугі перад польскім селянствам.

Сто гадоў таму назад Сташыц выступаў востра проці тых паноў, каторые зьдзекаваліся над сваімі падданамі-прыгоннікамі і угаварываў скінуць с селян прыгоннае ярмо, а тады край будзе дужы, багаты ды шчасьлівы.

Восьже таварыство ім Сташыца складаецца цяпер с саміх толькі селян—мужыкоў.

Мэта гэтаго таварыства: праз асьвету селян і зразуменьне сваіх селянскіх інтэрэсоў ісці да заможнасьці і культурнасьці усяго народу.

Усю работу у кружках Сташыца вядуць самі толькі селяне, бо вераць і кажуць, што для селян дабываць лепшай долі ня пойдуць тые, каму на руку, каб селянін быў цёмны, загнаны, няведоў дзе яго шкода, а дзе карысць. Усюды прычынай крыцьця Сташыцоўскіх кружкоў было гарачае жаданьне селян *самім сабе* тварыць лепшую будучыну, самім у свае рукі узяць усю гаспадарку краю, як правым сыном зямлі, зрошэнай крывёй і потам селянскім. Кіруючыся гэтай думкай аткрывалі па розных кутках польшчы польскіе селяне селянскіе хаўрусы, а пры хаўрусах памалу закладаліся бібліотэкі, шко-

# АТРУТА.

## (Кароткі жалобны абразок).

### Праява 4-ая.

*Тые ж і Раман.*

*Раман* (пяець дальш)... За-аўтра, за-аўтра, не-е сягоння,—ко-ожны пьяніца пяе-е... (спыніўся). Добры—дзень тату ў хату! Хвароба ў лес, здароўе ў косьці! Стуку-груку, хто тут? (ідзець па хаці, гугнава прыпевае).

Адна думка у Рамана,
Што кішэнічка падрана!
Німа грошы, віма дроў,—
А як выпью—ўжо й здароў!..

Не! Йшчэ адна думка ёсць: каб мая сухотніца паднялася. Ато, калі-і ўжо скрэмсалась! (З ласкай да Ганны). Ганна! Ганначка! Жоначка мая любая!.. (тужліва) Хварэеш? (Жоласна і без надзеі). Усё хварэеш... Пара ачуняць. Лепшай, галубка мая, а я, я... во табе сьвяты крыж,—дос жлуктаць гарэлку! Дос, дос і дос. Маё слова—сьвята! Ня буду й ня буду, наўсёды заракуся... Садзіцца на зэдлік і крыху маўчыць). А дзе-ж тата? Дзе Кастусь! (Ніхто яму не адказывае) А? (Пачынае злець). Аўдулька! Дзе дзед? Чуеш? Злезай адтуль тэйчас, нячыстая каланіца, а то я табе! Янку калышы! Я вас! Што вы мне? Што хачу—то й раблю. От йшчэ! Соткі ўжо выпіць нельга? Што такое значыць?! (Ходзіць—хістаеецца па хаці).

*Аудулька* (калышыць Янычку) Дзед с Касцючком пайшоў у поле... Дзед гараць беудзе.

*Ганна* (стогне). Божухна! Німа сумленнасьці у чэлавека... Апомнісь, Раман! Сьмерць мая, дзеткі нашы малые, ах...

*Раман.* До, дос ужо! Не стагні, не гнаі ты майго сэрца. Чуў тваю песьню. А тата... Як жэ ён гараць будзе, калі хамут, хамута... Я сам ўспашу. Ніхай стары не турбуецца, час ёсць. Успашым. Не сягоння—заўтра. Сяння галава баліць, спахмяліцца-б, хіба, цяпер. Ганупя, дзе твая суконная хвустка? Дай на сотку! Не сярдуй.

*Ганна.* Раман!..

*Раман.* Ну што, што? Ну на, забій мяне! Ну на, на зарэж мяне, а дай жэ ты мне на сотку, трэба ж мне апахмеліцца!

*Ганна.* Пабойся Бога, Раман... На хлеб дзеткам німа, што ты сабе ду-ма-еш?

*Раман.* Не стагні! Голая костка! Ад заможнаго бацькі браў, а што ты мне у гаспадарку прынесла? Сабаку печэнага... Во захварэла, падла! І здохнеш, хутка, падажджы... (Ганна ані слова, Аўдулька пачынае плакаць). Ня румзай, Аўдуля! У матку ўдалася! Заступніца... Я табе пакаж-ж-жу! На калені! Маўчы! Штоб твайго духу нячутно было! (Аўдулька ціха хліпае і станавіцца на калені).

*Ганна.* Божэ!..

*Раман.* Сыйду і кіну, кіну... Прападайце тут, хвароба на вас. Ссушылі мяне... Пью,—дык я ж вас і кармлю. Ы-ы-ы! (Скрыгочыць зубамі ад злосьці). Пілуюць—пілуюць, смурыжуць за кожну чарку, ці выпіў ці ня выпіў... З'ежця мяне! На зло прапью, усё прагуляю! Зарэжусь! Задаўлюсь! Зарэжусь!! (Хапае са стала тупы нож і шмуляець па горлу; Аўдулька крычыць, Ганна стогне дужэй, але нож сагнуўся, і Раман са злосьцю кідае яго на падлогу)...

*Ганна.* Худа мне, худа мне.., Ай, мляўка... Сьмертухна мая... Аўдулька, па цётку Хрысьцёну... па дзеда... А-а-а... Раман, сьвечку, грам-ні-цу...

*Раман.* (Схапіўшыся). Што? Што? Умірае? Хіба ж праўда? Аўдулька, бяжы, бяжы, дзетка, па цётку! (Аўдулька пабегла).

### Праява 5-ая.

*Без Аудулькі.*

*Ганна.* А-а-ах...

*Раман.* Ганначка, пастой... Што, што ты гэта? Прасьці, прасьці мяне, гэта гарэлка пашкодзіла... (Схіляецца над жонкай). Мо' даць вады?

*Ганна.* Ай, ай... Пад-ка-ці-ла пад грудзі.. Ва ды ы... (Раман пабег у сенцы за вадою, на сустрэчу знячэўку дзед; Раман адскочыў).

### Праява 6-ая.

*Ганна, Раман, дзед, Янычка (пачынае варушыцца Раман калышыць).*

*Раман.* Татуля, вады, вады! Штось з Ганнай... Слаба яна...

*Дзед.* Цяпер, «татуля!» Апокуль ты, аторва, лежынь ты пятроўскі! Бярэць карэц і, зачэрпнуўшы у сенцах вады, нясець). Пьянюга, згубіў жыцьцё маладзіцы, дзяцей абяздоліў... (Даець ваду Ганні). Пракляну, дачэкаеш, што пракляну, сынок; папомні. (Маўчыць троху). Раман!!! Дзе хамут? Куды хамут дзеваў? Прапіў! Усё у каршму занёс!..

*Ганна*( напіўшыся). Ох, тата, адлягло-о... Раман, памру я; калі а-а-ажэнішся у-у-удругі—жалей маіх дзетак, ня крыўдзі і не дазваляй крыўдзіць. Кінь выпіўку... (Раман стаіць, утупіўшы галаву у ніз, і цяжка дыхаець)

*Дзед.* Каня возьмуць за даўгі, каравёнку прадалі, хамут быў—німа. Усё на гарэлку пайшло. Раман, чуеш ты? Зямлю прадам, кіравацца буду, пакуль сілы хопіць, а унукаў пракармлю, а цябе... пракляну, калі не забудзешся шляху да каршмы...

*Раман.* Тата!

*Дзед.* Да старэцкаго хатыля бацьку давёў! У старцы астаецца, хіба, мне ісьці? Ты ж адзін у нас быў, матка як цябе пеставала, а ты як успамянуў нябожчыцу? Горэ ты маё...

лы, арганізовываліся селянскіе тэатральныe дружыны, малачарскіе суполкі, хаўрусные масьлярні, сушарні, фабрыкі і інш.

Усюды, дзе толькі паявіўся Сташыцоўскі кружок расьце хутка асьвета і заможнасць селянства,—зьнікае, нет ведама куды, загнанасць і прыбітасць, а на іх мейсца зьяўляецца у селян пачуцьце сваей годнасьці, пашана да сваіх селянскіх абычаёў, быту, адзежы. На зьездах найбольш можна бачыць селян у шэрых і белых даматканых сьвітках, вясковаго крою, селян ад плуга і касы, каторые заседаюць разам з вучонымі—селянамі і разам з імі радзяць аб патрэбах сваіх і патрэбах усяго польскаго краю.

Дзіўно гэта бывае тым, каторые ад вякоў прывыклі камандаваць селянамі, як скацінай, і дзеля гэтаго на Сташыцоўскіе кружкі нападаюць і рады-бы былі іх задушыць і не даць ім шырыцца, але у меру, як расьце паміж селян асьвета, растуць і працьвітаюць, на злосць завіднікам, Сташыцоўскіе кружкі.

Аткрыў сабраньне у пятніцу а 10 гадзіне маршалак Сташыцоўскіх кружкоў Ночніцкі; на кіраўніка сабраньнем папрасіў Крушэвскаго, а на замесьціцеля Космоўскую.

Космоўская прачытала прывітаньне зьезду ад тых, што ні маглі прыехаць і пратакол прошлагодняго сабраньня ды аб работах кружкоў за 1912 год. Новых кружкоў у 1912 гаду аткрылося 23, апрача гэтаго кружкі устроілі у 4 розных мейсцах курсы малочнай гаспадаркі. На нарадах прамаўлялі: Маліноўскі, рэдактар шчырай селянскай польскай газэты „Zaranie“ Голінскі, Стасяк, Ночніцкі, Курчак і другіе. Многа гаварылі аб патрэбе аткрыць сельска-гаспадарскі селянскі сындыкат (хаўрус-хаўрусоў), аб гандлю збожжэм, аб хаўрусных сьвірнях, а гандлю сьвінінай аб хаўрусных пекарнях.

У суботу сабраньнем кіраваў Курчак. Рэдактар Маліноўскі раіў, каб залажыць мужыцкі сельска—гаспадарскі сындыкат. Казаў ён, што на гэта, на пачатак хапіло-б 10 тысяч рублёў. Аб гэтай справе гаварыло каля 25 чэлавек. Урадзілі закладаць сельска-гаспадарскіе сындыкаты у паветах, а для іх усіх агульную канцэлярыю у Варшаві. Далей гаварылі аб малочнай гаспадарцы. Новых малачарскіх суполак аткрылося у апошнім гаду 10. Даход даюць добры. Рэдактар Маліноўскі раіў каб селяне хаўрусам заняліся гандлям сьвінінай, на такі способ, як у Галічыні. Гэткі хаўрус залажылі латышы і вялікіе маюць заработкі, гэтак за апошні год мелі даходу 19 тысяч, з гэтаго 10 тысяч атдалі на латышскіе школы.

У нядзелю сабраньне аткрылося а гадзіне 2 па поўдні; кіраваў сабраньнем Курчак. Осецкі чытаў рахункі хаўрусу малачарскіх суполак. 24 суполкі за апошні год прадалі на 61 тысячу рублёў масла. Хаўрус мае сваю крамку у Варшаві, крамка гэта дала 700 руб. чыстаго даходу. Далей Осіцкі казаў, каб лучыцца у хаўрусы і вырабляць ва ўсіх хаўрусах адзінакавы тавар. Маліноўскі казаў, што малачарства можэ даваць 30 мільёноў даходу селянам у год, і што ва ўсім польскім краю цяпер ёсць 100 малачарскіх суполок, а магло-б іх быць 2.000. Але найболей зацікавіла усіх у гэты дзень справа мужыцкаго дому у Варшаві. Маліноўскі казаў, што такі дом для мужыкоў патрэбны, у ім можэ быць сындыкат, крамкі і кватэры для селян, калі прыежджаюць у Варшаву, каб мелі дзе прытуліцца. Гэткі мужыцкі дом пабудавалі сабе латышы-селяне у Мітаве і што і у Варшаві можна пабудаваць гэткі дом за 100 тысяч рублёў. Пастанавілі складаць грошы на будову дому. Пад канец сабраньня Голінскі сказаў, што падвучыўшы сваіх сыноў селяне павінны трымаць іх у вёсцы, каб не панелі і не вырэкаліся селян; каб селяне выбіралі сумленных ды сьветлых людзей у валасьці. Курчак раіў узяцца селянам выводзіць насеньня (буракоў, морквы, канюшыны) бо гэта дае вялікі даход гаспадару.

Курчак закрыў сабраньне зычучы шчасьця у працы над падняцьцем селянства.

Едучы дамоў с селянскаго-польскаго зьезду, цешыўся я ў душы, што братні нам польскі народ прачыхаецца і ідзе сваей дарогай, здабывае і будуе сабе лепшую будучыну. Толькі гэту уцеху прыцьмевала мне туга па роднай маей бацькоўшчыне Беларусі, што ўсё у ей сном адвечным сьпіць і мала людзей, каторые-б працавалі, будзілі братоў сваіх. Але веру я сьвята у тое, што народ наш прачхнецца, ачуняе і стане да працы, як і другіе, а можэ... можэ і лепей ешчэ. Ужо відаць першые праменьня прабуднай зары, ешчэ год-другі жывой, разумнай, дружнай працы і мы пойдзем ўпярод здабываць *самі сабе* лепшую будучыну

*Вэніцэвіч.*

## Льготы населеньню.

Павэдлуг Маніфэсту 21 лютаго, населеньню дадзены ўселькіе льготы. Гэтак даруюцца ўсе нядоімкі непапраўных плацельшчыкоў падаткоў, што павінны былі выплачывацца ў казну. Дваранам дараваны тые грошы, што былі ім пазычэны на падмогу пасьля селянскіх безпарадкоў. Заводзіцца камітэт дзеля апекі над сіротамі—бяз розніцы стану і веры, што належаць да сельскаго населеньн. Пастаноўлена асыгнаваць грошы дзеля палепшэньня быту селян. Чыноўнікам зроблены палягчэньня пры выслузе пэнсіі і наград, ды прыказана выдаваць болей грошы на навуку іх дзяцей і т. д. Поруч з гэтым паменшэна на $^1/_3$ кара ўсім, хто прысуджэн у крэпасць, арэштанцкіе роты, вастрог з аграніченьнем праў. Гэтак сама скарочэна катарга на $^1/_3$, а хто прысуджен на ўсё жыццьцё, таму назначэна 20 гадоў. Заместа кары сьмерці назначаецца 20 гадоў катаргі. Даюцца палягчэньня і ссыльным, што былі у ссылцы ня менш 9 лет. Зусім знімаецца кара с тых, хто засуджэн павэдлуг стацей угалоўн. улож. 93, 94, 103, 104. 106 і 107, ды ешчэ павэдлуг 1575 улож. о нак. Так сама знімаецца кара с тых, што засуджны па ст. 128, 129 і 132 за праступкі у друку (кнігах, газэтах і т. п.) Паменшэны кары за праступкі на службе і т. п. Зняты адміністрацыйные кары. Пазволена вярнуцца з заграніцы тым, хто уцёк ад кары і цяперь папаў пад маніфэст, не караючы за выезд без пашпарта.

## Вайна.

Калі ў Расею ехаў пасланец да Гасударя с пісьмом ад аўстрыйскаго імператара, дык усе чакалі, што вось цяпер павінна наступіць згода між двумя суседкамі—Расеей і Аўстрыей, ды што абедзьві дзержавы распусьцяць сваіх запасных, каторых трымаюць на службе, баючыся вайны.

Гэтымі днямі ўрэшці чуткі гэтые споўніліся: расейскі і аўстрыйскі урад у адзін дзень абвесьцілі офіціяльна, што, каб давясьці згоду суседзкую, Аўстрыя атпускае запасных с полкоў над граніцай, а Расея пусьціць да хаты ў пагранічных округах тых салдатоў каторые ешчэ ў весені скончылі службу, але былі задзержаны аж дагэтуль. Цяпер страхі ваенные павінны скончыцца—прыпамсі да часу.

Тымчасам на Балканах неспакой ин толькі н спыняецца, а, паадварот, развіваецца ўсё болей. Грэкі пасьля доўгай асады ўзялі урэшці горад Яніну (як кажуць, дзякуючы здрадзе) і цяпер грэчэская армія мае свабодные рукі, дык можэ шмат школы зрабіць туркам. Кажуць, бытцым грэкі маняцца перэвязьці свае войска у Малую Азію. Але поруч з гэтым між хаўруснікамі на Балканах пачынаюцца сваркі і звадкі: каля Ускюба між боўгарскімі і сэрбскімі дабравольцамі вышла цэлая баталія ў каторай былі забітые і раненые, ў тым ліку адзін палкоўнік.

Вялікіе дзержавы звярнуліся да Балканскіх гасударств, як пасрэднік між імі і туркамі, каб зрабіць згоду. Але хаўруснікі глядзяць на гэта без ніякай ахвоты: яны хочуць чым больш зямлі захапіць у туркоў. Асабліва працівіцца згодзе Чорнагорыя: яны адны праз усю вайну не здалелі нічым пажывіцца, ды без ніякай карысьці для сябе штурмуюць Скутары, каторы не паддаецца. Вось чорнагорцы і надумалі датуль не рабіць згоды, пакуль не захопяць Скутары. Чакаць на гэта прыдзецца доўга. А тым часам боўгарам пара кідаць стрэльбы, а брацца за саху, бо іначэй голад чакае ўвесь боўгарскі народ. І боўгарам трэба скончыць вайну чым скарэй. Гэтак і ўвесь балканскі хаўрус можэ лёгка разсыпацца.

Гэтак скора могуць зрабіцца на Балканах вялікіе перамены.

## За айчызну.

З вялікай журбою і з болем сэрдэчным
Хачу сваю жальбу спісаць
З душы набалелай, з душы адзінокай,—
Ужо годзі сном мертвым нам спаць.
Чаму агарнулі так цяжкіе думы?
Чаму яны сэрцэ шчымяць?
У нашай старонцы, у нашай айчызні
Нам шкодные злыдні скігляць.
Як жалкі і брыдкі, ўсе ворагі злые,

---

*Раман.* Тата! Дос, апахмелюсь і навекі заракуся, Ці мне-ж ня тошна? Атруціла мяне гарэлка, згубіла жыцьцё...

*Ганна.* Ты малады йшчэ, Раман. Устрахніся. Ці хочэш, крый Божэ, каб я і с таго сьвету прыходзіла да цябе за дзетак спрэчацца, Рамане! Дай мне спакой.

*Раман.* (Пацьвярозеў). Татуля! Ганна! Ці я-ж нічога ні разумею? Ці мне-ж ні баліць?.. І ці я-ж ні зарэкаўся? Але-ж гарэлка гэта салодкая атрута... Як тэй агонь купальскі, завядзець яна цябе у такую круч, адкуль ўзвароту... Адбярэць і розум, і сумленьне, і жаласьць... (замарыўся).

*Дзед.* Праўда! То-ж кара Божа! Калісь раз казаў мне пакойны Габрыель, што ня трэба слухаць тых, што кажуць: «Разумны пье, ды вум не прапівае, а дурэнь і вадою абапьецца»... І разумнаго, і моцнаго, і працавітаго, і вялікаго пана і апошняго мужыка, і пісьменніка і цёмнаго чэлавека, усіх адзінакава калечыць яна, ува ўсіх адбіраець сілы... Бо то-ж кара Божа! За тое, што праз гарэлку чэлавек губіць розум, лепшы дар Тварыцеля, губіць абраз Божы, робіцца самагубцам і нечым бруднейшым за ўсякаго бруду!.. Чуеш ты, Раман?

*Раман* (ташнуе праўдзіва). Што мне рабіць? Я ні маю сілы, я ні змагу сябе! Цяжка мне... Хаджу, як шалёны... Ні хачу есьці, ні хачу піць, а... іду і прапіваюся да ніткі... На панахвіду па роднай мамачцы грошы прыблюў і пра-пра-піу-у-ў... (гудзець).

*Дзед.* Маліся, Рамане...

*Раман* (агоўтаўся ад плаку). Але-ж прысьпеў мой час... Татуля! Ганна! (Бразнуўся на калені перад абразамі і склаў перад тварам рукі далонямі). Божэ Міласэрдны! Ты ўсё бачыш і ўсё ведаеш! Памажы мне, Навышні! Клянуся Табе, што ад гэтаго часа ніколі...

*Дзед* (страшна гаворыць). Сынок! Ні грашы. Ні падманвай Бога? Колькі разоў, шмат разоў ты ўжо заклінаўся, Бажыўся—і усё дарэмна... Дык ня трэба-ж! Ня трэба прысягі калі німа пэўнасьці яе споўніць...

*Ганна.* Раман, не хітруй з Богам! Пакарае-е... А а-а...

*Раман* (тварыць сваё)... Ніхай буду я проклят, калі з гэтаго часу ня кіну піць паганае атруты да самае сьмерці!.. Ня мей я долі, шчасьця, калі... (Убачыў на палічцы грошы, усхапіўся). Што там? Скуль тут грошы? (Хочэ узяць іх, але дзед схапіў раней і пашоў да Яначкі, каторы плачыць).

*Дзед.* Рамане! Бог усё відзіць! Успомні, што ты казаў! (Выймае спавітога Яначку і трымае яго толька леваю рукою, у каторай і грошы, а праваю папраўляець у калысцы).

*Раман.* Тата, дай, дай грошы, мне толька апахмеліцца... Дай, больш ніколі, ніразу ня буду, дай—галава баліць... (Падскочыў к бацьку, і ірвануў з рукі грошы і маланкай пабег за дзьверы; Яначка скаўзануў з дзедавай рукі і грукнуўся галоўкай аб падлогу)...

*Ганна* (усё бачыла). Ай! А-а-а... (Раптам апынулась на падлозі, крыкнула, захлібнулась і умірае)...

### Праява 7-ая.

*Дзед і нябошчыкі.*

*Дзед.* (Схапіўшы мёртвае дзіцянё). О-о-о!.. Што гэта, Божэ! Дзе-ж праўда? Пакарай, Навышні, губіцеля свае крыві і цела, ні дай яму спакою ніколі за сьмерць непавіннаго дзіцяткі... Німа у мяне больш. сына.,. Праклінаю! Праклінаю!!! (Плачэ; тымчасам шпарка бяжыць, бразнула дзьвярмі цётка Хрысьцёна).

### Праява 8 ая.

*С цеткай Хрысьценай.*

*Хрысьцена.* Сваточак, чаго у вас плак, крык? Што з Янучком? (Дзіка крычыць). Памёр?! Ай Ганнуся? (Падбегла да цела Ганны). Памёрла?! Дзед здрыгнуўся). А. Божэ-ж мой, што ж гэта? Прачыстая Матка!... (Пачынае выць). А ма-е-ж вы дзе-тухны, а ма-е-ж вы лю-бы-е...

*Дзед.* Кара Божа! (Паклаў к матцы Яначку, схапіўся за галаву, страшна глядзіць на абразы і нешта шапочыць усё дужэй)...

**Заслона.**

**Максім Беларус.**

## Злавіу!

Дапісаўшы апошнюю страніцу прызыўных спіскоў, пісар Павал Дурундовіч разагнуў сьпіну і далёка працяг пад сталом ногі.

— Канец і Богу слава!—сказаў пісар і шпурнуў на стал ручку. Зірнуўшы на гадзіннік, ён борзда падняўся, сказаўшы:

— О-о-о!

Было каля поўначы. Стораж Грыгор даўно ужо спаў, разваліўшыся па падлозі каля дзьвярэй. С таго кутка, дзе ён спаў, нялося столькі ўселякіх зыкоў, што трудна было паверыць, каб гэтые зыкі вылеталі з аднаго чэлавека.

Цяпер толькі пісар зьвярнуў на гэта увагу і, зачыняючы шафу, сказаў, зірнуўшы у бок стоража:

— Маладзец, сам іграе і сам ўтурыць! Ігрышчэ дый годзі.

У спальні пісара даўно ужо чэкала ложка з мяккім матрацам на пружынах і з высока ўзбітымі падушкамі; запаліўшы сьвечку, пісар раздзеўся і лёг у пасьцель, згайдавуўшыся разоў пару.

— Хораша, чорт вазьмі! — сказаў пісар, па-

Вы роднаму краю майму!
Усіх вас злыдэрных я ведаю добра,
Збурыліся, знаю чаму:
Вам вольные шкодзяць ўсе нашы парывы;
Вы рупіцесь сціснуць людзей..,
А не! не здушыць вам ніколі на сьвеці
К пакуці прывыкшых грудзей!
Ужо льюцца праменьня гарачаго сьвету—
І хутка загіне цемраць.
Ня ўмёр і ня умрэць наш дух вольны, бадзёры:
Аб ясных днях будзем сьпеваць!

**Я. Журба.**

---

* *
*

Вы, панове, пазіраеце далёка
У блеску сонца з вялізарных плеч народных,
Але сьвятло крые шмат чаго ад Вас,—
Днём не бачыце Вы зорак пуцеводных.
Загляніце-жэ, будзь ласка, Вы у студню:
Ужо даўно счарнела і згнівае,
Але дно яе і ў ночы і ў палудню
У вадзе люстэрнай зоры адбівае.
К тым, каго жыцьцё заціснуло глыбока
Уніз, у норы падзямельные пад Вамі,
Вы, панове, хоць і бачыце далёка
Загляніце ў душы—студні са сьлезамі.

**Максім Богдановіч.**

---

# З Беларусі і Літвы.

## Вільня.

### Праца саюзу „Міхаіла Архангела“.

Віленскае інтэнданцкае упраўленьне, па просьбе дэпутата Пурышкевіча, аддало гэтаго году мейсцоваму аддзелу „Союзу Міхаіла Архангела“ падрад на пашыцьце 15,000 гімнастычных кашуль для салдатоў. Саюз „з дабрачыннай метай“ раздаў гэту работу беднаму населеньню гор. Вільні, каб даць змогу зарабіць бедным людзям лішнюю капейку.

Мейсцовые саюзьніцкіе газэты выхвалялі гэткі добры пастапак і міласэрднае сэрцэ саюзьнікоў.

Але, вынік такіх «добрых» паступкоў аказаўся не саўсім добры. Адна с камісій, што прыймала гэтые кашулі, са 130 пашытых саюзьнікамі кашуль забракавала 125.

Выявілося, што саюз, беручы па 11 капеек за пашыцьце кожнай кашулі ад інтэндантства сам плаціў бедным людзям толькі па 5 капеек, а рэшту забіраў на сва «ідэйные» патрэбы—пагромную літэратуру, падаркі вэрхаводам саюзу і інш. т. п.

### Літоускі дом у Вільні.

На будоўлю літоўскаго дому у Вільні у каторым будзе памешчацца літоўскае науковае таварыство і літоўскае штукарскае таварыства, ужо літвіны сабралі 16,702 руб.

### Адзел національнаго саюзу.

Віленскі губэрнатар пазволіў атрыцць атдзел „Національнаго Саюзу“ у вёсцы Граніčах Красасельскай валасьці, Вілейскаго павету.

### Выкрылі убіуцу.

Убіўцу Арцікоўскіх гэтымі днямі выкрылі. Гэта 18 гадовы хлопец, селянін, Антон Мачульскі, каторы забіўшы мужа і жонку Арцікоўскіх знайшоў пры іх 32 руб., грошы гэтые прапіў і будучы пьяным нераз хваліўся сам сваім убіўствам, грозячы забіць таго хто выкрые яго.

### „Картачная хвароба“.

Апошнімі часамі „картачная хвароба“ як пошэсць якая уваліласа у гуту **„Залесьсе“** і захапіла нашу і так цёмную маладзеж; вось вам абразок з натуры.

Работу у гуці кончылі. Струмант пахаваны; станкі пастаўлены на места. Стомленые працай гутнікі расходзяцца па хатах. Чаму-ж грамада хлопцоў—дзяцюкоў ня йдзе на атпачынак?—Гэта карцёжнікі. Вось бяруць стойкі, ставяць поспол дзьве, кладуць шырокую бляху, выймаюць карты, садзяцца кругом і пачынаецца гульня. Забыліся аб усім на сьвеці! Памерлі. Толькі печ, як казачная змея, разлеглася сярод грамаднаго будынку, дыхаючы сваімі вокнамі-горламі агнём і дымам. Вось загудзела, зашумела у печы і раптам стала рвацца полымя і як-бы зазлуваўшыся стало пячы у сьпіву карцёжнікоў. Але ім што за наўда? У іх руках карты і чорная бляха. Толькі ужо, як добра прыпячэ, дык толькі пацісьне другі плечыма, а не, рукой паскрабе. Відаць баліць, пячэ, але нічога ня зробіш, трэба гуляць... Надакучыла глядзець—іду. За гадзін 6 прыходжу ізноў і находжу іх ешчэ гуляючы. Але цяпер абраз змяніўся: твары закопчэные дымам, шчокі запалі, вочи пачырванелі. Раптам падымаецца адзін са свайго мейсца, парваны каптан у накідку, без шапкі, з налітымі кроўю вачамі давай раўсці: «Грыўню дасці ці не?! Зара падавай! скарэй! бо вот як відзіш»... паказываючы кулак дзесяці гадоваму хлопчыку. А той:—якую-ж грыўню? усяго-ж капейку, адну усяго... і плывуць образы дзікасьці адзін харашэй другога. Дык вось які малюнак. Вось тая хвароба, каторая завецца «картачнай». Лячыць гэгу хваробу можна толькі адным спосабам, гэта—чытаньнем,, злаща чытаньнем, у тэй мове каторая найбольш зразумела, найбольш трапляе у душу чэлавеку.

Дык кінем-жэ мы гэту хуліганскую забаву, каторая губіць нашы маладые сілы. Трэба узяцца за працу і запрацаваные грошы крывавым мазалём грэх марнаваць, а лепей злажыцца, да выпісаць сабе газэту. Чытаючы чэлавек лепшым робіцца, пачувае сваю еднасць з людзьмі, у сэрцы расьце парыў гарачаго пачуцьця, любоў к бліжняму і свайму дарагому, роднаму. Гэта трэба памятаць рабочаму. Ні картамі дабро робіцца, а навукай і працай.

*В. Явар.*

**с. Бакшты,** Вілен. губ. Ашм. п. Селяне гэтаго села, прыгаварам сваім у 1909 г. пастанавілі закрыць усе піўные у Бакштах. Хоць гэта было зроблена фармальна, усёж такі нават лік піўных ня зменшыўся, за тое аткрыта яны ні маглі таргаваць і на аткрыцьце тут піўной, ніхто ня мог дастаць пазваленьня у сілу пастаноўленнаго селянамі прыгавара. Але з нашымі селянамі многа чаго можна зрабіць абы толькі была пры гэтым выпіўка. Гэтак сёлета селянін Ціхон Сазановіч, жадаючы аткрыць піўную у Бакштах, добра пачаставаў нашых мужычкоў гарэліцай і яны за подпісам 83 чэлавек і сельскаго старасты Мікадыма Буцькі, далі прыгавар у адмену прыгавара зробленаго у 1909 г., даводзючы: „што мы испытываемъ крайное неудобство и большое затрудненіе въ доставкѣ пива изъ сосѣднихъ мѣстечекъ на свои свадьбы, крестины и другіе *хозяйственныя* (?) *нужды*, а кромѣ того, мы сознаемъ, что *отъ употребленія нами казеннаго вина большій является вредъ, чѣмъ отъ употребленія пива»*. (Словы с прыгавару).

Каб прышлося даць прыгавар гэтым селянам на аткрыцце школы, дык і кіём с хаты трудна былоб вытурыць, бо ведаюць, што на гэтакім сходзі ні дадуць выпіць.

Ужо-ж здаецца і так пьянства і разбоі у Бакштах вядуцца, як нідзе лепей, а ешчэ хочэцца болей піць, прапівать працай здабытые медзякі, а потым хварэць, а часам, праз лішэк жару, марнець у вастрозі. Толькі трэба абдумаць, то рэдка дзе які зладействы, убіўствы і інш. брудные справы бываюць без пьянства; чэлавек, як выпье, дык ні то дурнее, ні то шалее, робіць усё тое, што толькі наскочэ на розум, асмеліваецца замахнуць сякерай на родную матку, ці бацьку і яму тады здаецца, што ня будзе ні суду, ні якой з ім расправы і усё сойдзе гладка, як лепей ня трэба. Але гэта толькі здаецца, бо і прыказка кажэ „як пьян, дык капітан, а як прасьпіца, дык сьвіні баіцца“. А і праўда—агледзіцца, ды поздна, чыж ня лепей было б аткрываць чытальні, ці выпісываць хаўрусам кніжкі,—абходзілося-б зусім танна, быў бы прымер; дзеткам і у самых што колечы ды осталося-б разумнаго у галовах. Сьмех ад людзей, учыняць такіе прыгавары, называць выпіўку «хозяйственным нідастаткам».

Пара апомніцца і Вам, браты—Бакштане, што мы, лепшай долі, як настаўляем карчмоў, сабе ні здабудзем, мы і так далёка адсталі ад другіх народоў; нам трэба самім здабываць супольнальнай працай сабе лепшую будучыну, бо кажны з нас ведае, што толька той жне, хто пасее!..

*П. М.*

## Мінск.

### Выбары у гарадзкую думу.

Паступовая часць выборшчыкоў у гарадзкую думу назначыла кандыдатам на гарадзкога галаву цяперэшняго гласнаго, і маршалка доктарскаго таварыства, доктара Яноўскаго, каторы атрымаў і на прошлых выбарах такое чысло галасоў, што пытанье аб тым, каго зацьвердзіць,—Яноўскаго ці Хржонстоўскаго,—было перэсланае у Пецярбург. Верх узяў Хржонстоўскі, цяперэшні галава, дзякуючы падтрыманьню мейсцовай адміністрацыі, с каторай ён у прыяцельскіх стасунках.

Мы ешчэ адмецім аднаго с прэдстаўнікоў выбарнай хаўрузіі у гарадзкую думу, гэта ягомасць Янчэўскі, старадумскі прэдседацель гарадзкой рэвізіоннай камісіі, быўшы член першай Гас. Думы, вядомы сваім змаганьнем з нябошчыкам графам Чапскім, тагочасным гарадзкім галавой у Мінску. Удатны праект Чапскаго аб устанаўленьні

---

цягаючыся, і прыятнае пачуваньне агульнаго здаволеньня ахапіло ўсё яго цела.

— Стушыўшы сьвечку, пісар да грудзей толькі нацягнуў лёгкую коўдру, бо на дварэ і у хаці была душна, як у лазні.

Колькі мінут пісар палежаў спакойна, думаючы аб сім і тым. Яму было добра: непрыятная работа, прызыўные сьпіскі, закончэна; земскі начальнік знайшоў ўсё ў парадку; рэвізія так сам нічога кепскаго не заметіла. Адным словам, пісар папаў у тую паласу жыцьця, калі чэлавеку шанцуе і ўсё ідзе, як па пісанаму. І сон, салодкі сон, з мінуты на мінуту гатоў быў самкнуць яму вочы. Але толькі што стаў ён дрэмаць, як па яго сьпіне барадзенька прасунулася маленькая, чорная, жвавая жывёлка, ўсё роўна, як там закраўся чарток і паказытаў яго каласком. Пісар цопнуў усей жменяй па тым мейсцы, дзе прапоўз няпрошэны госць, моцна надушыўшы сьпіну. Маленькі вораг істрыкнуў і прапаў. Чутачку счэкаўшы, зноў пачуў пісар лёгкі сьверб, ужо на назе, як бы хто запускаў туды павольненька тонкую голачку. Прыгнуўшы нагу, каб спрытней было зла віць скочку, пісар раптам накрыў пальцамі свярбючае мейсто і, крэпка паціскуўшы, пачёў па назе. Праклятая жывёлка зноў прапала. Ня ўспеў ён, як сьледуе, пачухаць нагу, як у яго засьвярбеў зразу і карк і бок, цапер ужо шмат мацней, як бы яго секанулі крапіваю. Сон пісараў адразу прапаў.

— Бадай вас агонь высмаліў, як вы смаліце,—сказаў пісар, з сілаю хапаючыся за карк.

Пісароў карк быў абросшы густымі валасамі. Ловячы блаху, ён няўмысля скрабянуў сябе за валасы, ды так моцна, што чуць ня крыкнуў ад болю. Гэтак, бывала, як ён быў малы, нябошчык дзядзька яго, паказваў яму, „як даюць квасу“. Уся гэта гісторыя кончылася тым, што пісар узлаваўся.

— А штоб вас маланка папаліла!—сказаў ён і падняўся. Абмацаўшы на століку серчыкі, пісар запаліў сьвечку і адвярнуў коўдру. Жвавые скочкі разам скаканулі ва ўсе бакі і пахаваліся; толькі адна разоў тры кульнулася па падушцы, і пісар разоў тры пакрываў яе рукою, але спрытная скочка кожны раз шчасьліва выкручывалася ад сярдзітай пісарэўскай рукі.Ператрос ён ўсе бэбахі на пасьцелі, але нічога ні злавіў. Хоць бы адна, сьцерва, папалася, хоць бы злосць спагнаў. Абрэвізаваўшы пасьцель і ўласные пазухі, пісар зірнуў на сьцену. Там павольна, не сьпешаючыся поўз клоп. Здавалося, што ён сабраўся у вялікую дарогу, толькі што не было у яго палкі і клунка.

— А, гад! а пашпарт у цябе ёсць?—спытаўся пісар і падскварыў яго свежаго.

Падняўшы сьвечку у гару, пісар азірнуў увесь пакой. Праз вокны глядзела черная ноч. Вакруг было ціха. Толькі з другога ложка данасіўся мерны сап яго жонкі ды з за сьцяны Грыгор не перэставаў спраўляць ігрышчэ.

— І скачыхі іх не кусаюць,—пазайздросьціў пісар і зноў патушыў сьвечку.

Колькі часу пісар лежаў з адкрытымі вачамі. Сон ужо ня йшоў да яго. Але памаленьку, ён зноў вачынаў сьцішывацца, здавалося, ужо цяпер баяліся чапіць пана пісара, і ён ужо забываў пра іх. Як бы гэтаго толькі яны і чэкалі: толькі што ён павярнуўся на другі бок, як нехта крэпка — пякуча укусіў яго за жывот. Пісар увесь аж падскочыў.

— Ах, каб на вас Бог халеру напусьціў, — лаяўся пісар. А тут за сьцегняк яго, як утне!

— Каб на вас мор і упадкі! — сярдзіта буб віў пісар і варочаўся, як мянёк на скавародзе. Цяпер пісар не выстрэнчываў чухаць пакусаные мейсцы. Усюды яго цялі: за ногі, за рукі, за сьпіну і бакі. Пацёўшы правою рукою па левым баку, пісар абмацаў нешта і крэпка прыдушыў пальцам.

— Трасцу ты цяпер вырабішся!—злорадным голасам гаварыў пісар.

Схапіць у пальцы ён не адважываўся, бо чуў, што стоіць толькі зьмяніць палажэньне пальца, як яго дабыча уцячэ. А пусьціць яе шкада: яна адна можэ дваццаць разоў укусіла яго. Трэба злавіць брыду, і хоць па наздзекавацца з яе.

Як раз прачхнулася і жонка.

— Ты ня сьпіш, Оля?—пытае пісар жонку, ні аднімаючы рукі.

— Не!

— Дык ўстань, брат, запалі сьвечку і падыдзі сюды.

— Што там у цябе?

— А вот ідзі—бузеш ведаць.

Жонка паднялася с пасьцелі.

Запаліўшы сьвечку і зірнушы на пісара, як ён трымаўся за бок, жонка была спалохалася. Але пісар быў здароў, бо пазіраў вясёла, як і ўсякі, хто злавіў злодзея.

— Ты ведаеш Оля: качаюся гадзін дзьве, ніяк не засну. Блох у нас, як пяску. А цяпер я нешта злавіў, і чорт яго ведае што.

— Адкуль тые блохі? Хіба клешч, бо ты-ж любіш гэтые маёўкі ў лесі.

Пакажы!

— Свяці сюды!

Сабраўшы усе сілы, пісар ешчэ раз прыдушыў свайго варага і паволі стаў брацць пальцамі. Вабраў. Пацягнуў—ні адрываецца.

— Клешч, каб ён згарэў!—сказаў пісар.

— Дай зірну,—сказала жонка і нагнулася, а пісар адняў руку.

— Ну?

— Тфу, дурэнь: гэтаж барадаўка!

*Тарас Гушча.*

---

